# Гісторыя

*Да 50-годдзя пачатку*
*Вялікай Айчыннай вайны*

У. К. КОРШУК, У. І. ЛЕМЯШОНАК

## ФАШЫЗМ: ЗЛАЧЫННЫЯ МЭТЫ, ЗЛАЧЫННЫЯ СРОДКІ

Усё далей адыходзяць ад нас грозныя гады Вялікай Айчыннай вайны. Мы пераацэньваем яе падзеі. У больш трагічным святле раскрываецца праўда аб вытоках і вінаватых вайны, аб стратэгах і тактыках, аб цане перамог і аб ахвярах, якіх магло быць менш. Да таго ж сёння многім маладым зусім невядома, што нёс фашызм нашай краіне і свету.

Звернемся да дакументаў, сфабрыкаваных гітлераўскім кіраўніцтвам. Гэта дырэктывы і акты германскага вярхоўнага камандавання, стэнаграфічныя запісы пасяджэнняў і гутарак у стаўцы «Фюрэра», дзённікі кіруючых дзеячаў «трэцяй імперыі» (Гебельса, Розенберга, Гальдэра і іншых), дакументы, архівы «усходняга міністэрства», імперскага кіраўніцтва бяспекі і г. д.

Захоп «зямлі і глебы» Гітлер лічыў мэтай сваёй палітыкі. У сваім «евангеллі агрэсіі» «Майн кампф» ён пісаў: «Мы, нацыянал-сацыялісты, павінны прытрымлівацца нашай знешнепалітычнай мэты: даць нямецкаму народу на гэтай планеце дастойную яго тэрыторыю і зямлю». Менавіта тут знаходзіўся зародак той злавеснай ідэі, якая праз некалькі гадоў прывяла да стварэння генеральнага плана «Ост».

Як вядома, распрацоўка канкрэтнага ваеннага плана нападзення на СССР пачалася вясной-летам 1940 г. Адначасова фарсіраваліся і падрыхтоўчыя мерапрыемствы (у першую чаргу па лініі СС), якія павінны былі распрацаваць схему акупацыйнай адміністрацыі. Ужо ў маі Гімлер распрацаваў зусім сакрэтны дакумент «Некаторыя думкі аб зносінах з іншародцамі на Усходзе», які па волі Гітлера быў даведзены да ведама толькі самага вузкага кола асоб — некалькіх гаўляйтэраў, начальнікаў галоўных кіраўніцтваў і вышэйшых чыноў СС. Дакумент, які азначаў пачатак бязлітаснага ажыццяўлення праграмы знішчэння, пакаранняў і распраў. «Усход» цяпер належыць СС»,— так дэклараваў адзін з лідэраў фашызму.

У гэтым дакуменце выкладзены ідэі, якія даўно выношваліся нацысцкай вярхушкай. Галоўная з іх заключалася ў ператварэнні захопленых тэрыторый Усходняй Еўропы ў аб'ект каланізацыі і тым самым — у прыступку да дасягнення Германіяй сусветнага панавання. Для гэтага Гімлер прапаноўваў наступнае: расчляненне насельніцтва Усходняй Еўропы на бязлікую колькасць дробных груп і груповачак, што павінна было перашкодзіць любым спробам іх аб'яднання; паступовае знішчэнне адна за адной славянскіх народнасцей, як «недачалавекаў Усходу», ператварэнне асноўнай масы «іншароднага насельніцтва ў паўпісьменных рабоў (ліквідацыя ўсіх відаў адукацыі вышэй чатырох класаў). «Іншародцы» павінны ўмець: «лічыць не далей чым да 500; пісаць сваё імя; ведаць закон божы, падпарадкоўвацца немцам; быць сумленным, паслухмяным і бравым. Чытаць ім не патрабуецца»[1].

16 ліпеня 1941 г. на нарадзе ў Гітлера было намечана расчляненне СССР на чатыры рэйхскамісарыяты («Остланд», «Масковія», «Украіна», «Каўказ»). На падставе прапаноў Розенберга было арганізавана Імперскае міністэрства па справах акупіраваных усходніх тэрыторый[2]. «Канчатковае пла-

наванне» акупацыйнай палітыкі на Усходзе ўзялі ў свае рукі кіраўнікі СС — паліцэйска-карніцкага апарата фашысцкай Германіі. Менавіта на СС было ўскладзена выкананне самых крывавых, самых страшэнных злачынстваў, прычым злачынстваў, пастаўленых на прамысловую аснову. СС загадвала «індустрыяй смерці» ў сотнях концлагераў і тысячах засценкаў гітлераўцаў.

Гітлер у сваіх «застольных гутарках» не раз вяртаўся да канчатковых мэт захопу СССР. Так, 8—9 кастрычніка 1941 г. ён гаварыў аб тым, што рускіх «не трэба вучыць». Тут жа ён развіваў праграму засялення рускіх тэрыторый імперскімі пасяленцамі. «На Усход трэба пасылаць маладыя сілы... Мэта нашай усходняй палітыкі,— падкрэсліваў ён,— рассяліць на гэтай тэрыторыі каля 100 мільёнаў германцаў і стварыць тут асвоеныя вобласці. Трэба прыкласці ўсе намаганні, каб з жалезнай настойлівасцю пасяляць там адзін мільён немцаў за другім...»; 27 ліпеня 1942 г.: «Выдатнае значэнне рэйхсфюрэра СС заключаецца не ў тым, што ён кіруе войскамі СС і паліцыяй, а ў яго функцыі імперскага камісара па ўмацаванню нямецкай расы... Камісар адказны за перасяленне... на Усход. Гэта перасяленне ўяўляе сабой гіганцкую задачу»[3].

Гэтыя і іншыя выказванні Гітлера і былі пакладзены ў аснову плана «Ост», зыходная задума якога была сфармулявана яшчэ ў маі 1940 г. Першы варыянт гэтага плана датаваны 15 ліпеня 1941 г. Абмеркаванне яго ў ведамствах рэйха прыпадае на зіму-вясну 1942 г. Другі (асноўны) адносіцца да 28 мая 1942 г. і ў прынцыпе зацверджаны Гімлерам у чэрвені.

Распрацаваны па асабістаму ўказанню Гітлера, гэты план уяўляў сабой комплексную праграму асваення і германізацыі «усходняй прасторы» і яго эканамічных рэсурсаў. У яго аснову быў пакладзены прынцып «знішчай, падзяляй і ўладарнічай». Насельніцтва, якое жыло на ўсходніх землях, павінна было прайсці сартаванне. «Найбольш прыгодную ў расавых адносінах частку» намячалася анямечыць, а «расава непаўнацэнных» або ператварыць у паслухмяных рабоў, або знішчыць фізічна.

На многіх старонках плана «Ост» выкладаецца працэс паэтапнай каланізацыі і германізацыі, масавага знішчэння народаў Савецкага Саюза, народаў славянскіх краін. Першапачаткова меркавалася выселіць 31 млн. чалавек. Затым паступіла ўдакладненне — ліквідаваць 46—51 млн. У далейшым прадугледжвалася расшырыць першапачатковыя «прыкідкі» на тэрыторыі «да самага Урала». На працягу 25—30 гадоў намячалася знішчыць 120—140 млн. чалавек у Польшчы і Савецкім Саюзе і засяліць гэтыя тэрыторыі 8—9 млн. немцаў [4].

Страшны лёс рыхтаваўся для беларускага народа: намячалася «высяленне» (пад тэрмінам «высяленне» часцей за ўсё меліся на ўвазе акцыі фізічнага знішчэння людзей) 75 % насельніцтва, а астатнія належалі анямечванню і выкарыстанню ў якасці рабоў.

У ходзе вайны, апіраючыся на план «Ост», нацысты распрацоўвалі кароткатэрміновыя канкрэтныя задачы па знішчэнню насельніцтва СССР. Матэрыялы такіх распрацовак выяўлены ў дакументах рэйхскамісарыята «Остланд». Выкананне іх было разлічана на бліжэйшыя чатыры гады пасля меўшагася «пераможнага» заканчэння вайны Германіяй.

Так, ва ўсіх буйных гарадах Беларусі фашысты мелі намер стварыць паселішчы для прывілеяваных слаёў нямецкага грамадства. Колькасць мясцовага насельніцтва, якую можна было б пакінуць у гэтых гарадах, вызначалася дакладным разлікам: на кожнага пана «вышэйшай германскай расы», якімі лічылі сябе гітлераўцы — два рабы «ніжэйшай расы». Так, у Мінску і вобласці намячалася пасяліць 50 тыс. нямецкіх каланістаў і пакінуць 100 тыс. мясцовага насельніцтва, у Маладзечна і яго наваколлі — адпаведна 7 тыс. немцаў і 15 тыс. беларусаў, у Баранавічах — 10 тыс. немцаў і 20 тыс. беларусаў, у Гомелі — 30 тыс. немцаў і 50 тыс. мясцовых жыхароў, у Магілёве і Бабруйску — па 20 тыс. немцаў і 50 тыс. жыхароў [5].

У генеральным плане «Ост» замоўчвалася, якім чынам СС збіралася правесці знішчэнне сваіх ахвяр. Але ў нас ёсць другі дакумент — «Папярэдняя праграма рэйхсфюрэра на мірны перыяд». У ёй указвалася, што для «выканання задач у новай прасторы на Усходзе», неабходны спецыяльныя асігнаванні і людская сіла для будаўніцтва ваенных паселішчаў, канцлагераў. Меркавалася стварыць асаблівыя «будаўнічыя брыгады», кожная па 4800 чалавек. Фарміравацца яны павінны былі з тых жа вязняў, усяго 29 млн. чалавек!

Для СС і нацыскага кіраўніцтва генеральны план «Ост» быў рэальнай асновай дзеянняў на тэрыторыі Польшчы і Савецкага Саюза. Ажыццяўляю-

чы яго, гітлераўцы актыўна пачалі ствараць на акупіраванай тэрыторыі лагеры смерці, якія штодзённа знішчалі дзесяткі тысяч савецкіх людзей. Толькі ў Беларусі такіх лагераў з філіяламі і аддзяленнямі налічвалася больш 260. У іх за тры гады акупацыі было знішчана звыш 1,4 млн. савецкіх грамадзян [6].

Адным з самых буйных быў Трасцянецкі лагер, які знаходзіўся ў 10 км на ўсход ад Мінска. Па колькасці знішчаных людзей гэты страшэнны камбінат смерці стаіць на трэцім месцы пасля Асвенцыма і Майданека. У Трасцянцы гітлераўцы расстралялі, закатавалі, задушылі газамі, спалілі ў крэмацыйных печах і на кастрах, закапалі ў зямлю звыш 206,5 тыс. чалавек. Усяго толькі ў Мінску і яго наваколлях гітлераўцы знішчылі каля 400 тыс. жыхароў горада і іншых населеных пунктаў Беларусі.

Важнейшым сродкам рэалізацыі злавеснага плана «Ост» былі карніцкія аперацыі гітлераўцаў, якія праводзіліся з мэтай заняволення і знішчэння савецкага народа, рабаўніцтва маёмасці. За гады акупацыі Беларусі фашысцкія захопнікі правялі больш 140 буйных карніцкіх аперацый, у ходзе якіх спалілі 5454 населеных пункта разам з жыхарамі.

Метады варварскіх расправаў з грамадзянскім насельніцтвам, знішчэнне населеных пунктаў разам з жыхарамі сталі паўсядзённай практыкай гітлераўскіх захопнікаў. Начальнік аператыўнага штаба паліцыі бяспекі і СД у Мінску штандартэнфюрэр СС Піфрадэр у дырэктыве начальнікам разведвальных каманд ад 18 лістапада 1942 г. патрабаваў, каб спальванне вёсак абавязкова суправаджалася пагалоўным знішчэннем усіх жыхароў, бо, пісаў ён, «вопыт вучыць, што калектыўныя расстрэлы, спальванне вёсак без поўнай ліквідацыі або высялення іх жыхароў прыводзяць толькі да адмоўных для нас вынікаў».

Аб тым, як рабіліся гэтыя страшныя злачынствы, сведчаць захаваныя ў архівах данясенні, справаздачы фашысцкіх катаў. Прывядзём некаторыя з іх.

**Са справаздачы аб вопыце знішчэння населенага пункта Боркі 10-й ротай 15-га паліцэйскага палка**

28 верасня 1942 г.

«21 верасня 1942 г. рота атрымала заданне знішчыць населены пункт Боркі, размешчаны ў 7 км на ўсход ад Макран...

Аперацыя праходзіла планамерна, выключаючы зрухі некаторых яе этапаў у часе... Расстрэл пачаўся ў 9 гадзін 00 мінут і закончыўся ў 18 гадзін 00 мінут. Расстрэл праходзіў без усякіх ускладненняў, падрыхтоўчыя мерапрыемствы аказаліся вельмі мэтазгоднымі...

Расстраляна 705 чалавек, з іх мужчын — 203, жанчын — 372, дзяцей — 130... Затрачана: вінтовачных патронаў — 786, патронаў для аўтаматаў — 2496 штук...

Нам. камандзіра роты oберлейтэнант ахоўнай паліцыі

Мюлер»[7].

У час карніцкай аперацыі пад кодавай назвай «Котбус», праведзенай гітлераўцамі ў маі — чэрвені 1943 г. у шэрагу сумежных раёнаў Мінскай, Вілейскай і Віцебскай абласцей, фашысты спалілі дзесяткі вёсак, знішчылі каля 10 тыс. чалавек і больш 6 тыс. выслалі на катаргу ў Германію.

У сярэдзіне мая 1943 г. у вёску Кабылева Васілевіцкага раёна Палескай вобласці надыйшлі каля 300 карнікаў-эсэсаўцаў. Яны ачапілі яе і ўсіх жыхароў сагналі ў цэнтр вёскі. Пачалася крывавая расправа. Мужчын закрылі ў дамах і на вачах жонак, маці і дзяцей расстралялі і спалілі. Старых і жанчын з груднымі дзецьмі і падлеткаў закрывалі па 20—30 чалавек у дамах, закідвалі гранатамі і падпальвалі. З абыякавасцю садыстаў фашысцкія каты за адзін дзень расстралялі і спалілі 1050 чалавек [8].

Гітлераўскія каты з асаблівай жорсткасцю знішчалі савецкіх дзяцей, як сацыяльна-біялагічную аснову нашага народа. Дзяцей прымушалі да цяжкай працы, марылі голадам, змяшчалі ў канцэнтрацыйныя лагеры, вывозілі на катаржныя работы ў Германію. Сярод тысяч знішчаных дзяцей ахвярамі фашыстаў сталі 54 выхаванцы Дамачоўскага дзіцячага дома Брэсцкай вобласці. 23 верасня 1942 г. гітлераўцы ўварваліся ў дзіцячы дом, пагрузілі дзяцей на машыну і павезлі. Іх расстралялі непадалёку ад ракі Заходні Буг. Відавочцы гэтай раправы расказвалі, што зямля на месцы расстрэла была прамочана крывёю нявінных ахвяр.

З ізуверскай жорсткасцю знішчаліся дзеці, якія знаходзіліся ў канцэнтрацыйных лагерах. Толькі ў адным канцлагеры ў Баранавічах фашысты забілі 5200 дзяцей. Зімой 1942 г. непадалёку ад Магілёва былі па-зверску знішчаны каля 50 жанчын і дзяцей. Відавочца расказваў, што гітлераўцы на-

гамі паскідвалі ў прыгатаваную магілу дзяцей і далі па іх некалькі чэргаў. Дзеці, якія знаходзіліся на дне ямы, яшчэ заставаліся жывымі. Але фашысты загадалі засыпаць яму.

Паводле афіцыяльных даных, гітлераўцы ў Беларусі расстралялі, закатавалі, павесілі, спалілі жывымі і задушылі ў «газавых камерах» (душагубках) больш 2,2 млн. савецкіх грамадзян. Каля 380 тыс. было выгнана ў Германію, многія з іх загінулі. Новыя, больш удакладненыя звесткі даюць магчымасць гаварыць аб тым, што людскія страты рэспублікі былі значна большымі: не менш 2,8—3 млн. чалавек [9].

Злачынствы, якія планавалі і здзяйснялі фашысты на акупіраванай савецкай зямлі, па масавасці, планамернасці, вытанчанасці гістарычна беспрэцэдэнтныя. Паводле даных Інстытута ваеннай гісторыі бундэсвера ФРГ, да 1 лютага 1942 г. загінула 60 % нашых палонных, захопленых фашыстамі ў 1941 г. Усяго за час вайны ў фашысцкіх лагерах і турмах было закатавана або пакарана каля 5 млн. савецкіх патрыётаў.

Сёння нават цяжка ўявіць, якімі былі б вынікі крывавых злачынстваў, калі б не гераічная барацьба ўсяго савецкага народа супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на фронце, у партызанскіх атрадах, у падполлі, калі б не самаадданая праца ў тыле, адзінства народаў усёй краіны. Савецкая Армія знішчыла фашызм, не дала яму ператварыцца ў рэжым каланізацыі.

[1] Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны. Мн., 1983. Т. 1. С. 167.

[2] Гл.: Безыменский Л. А. Генеральны план «Ост»: замысел, цели, результаты // Вопросы истории. 1978. № 5. С. 78; ЦГАОР СССР. Ф. 7445, оп. 2, д. 163, л. 433—443 // Пер. с нем.

[3] Безыменский Л. А. Указ. соч. С. 82—83.

[4] Гл.: Преступные цели — преступные средства: Документы об оккупационной политике фашистской Германии на территории СССР (1941—1944 гг.). М., 1985.

[5] Гл.: Всенародная борьба в Белоруссии... Т. 1. С. 168.

[6] Гл.: Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне (1941—1945): Энцыклапедыя. Мн., 1990. С. 291—292.

[7] Преступные цели — преступные средства... С. 103—105.

[8] Гл.: Всенародная борьба в Белоруссии... Т. 2. С. 38.

[9] Гл.: Звязда. 1991. 15 студзеня.

У. П. ПАЎЛАЎ

## НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНЫЯ РАБОТНІКІ — УДЗЕЛЬНІКІ МІНСКАГА ПАДПОЛЛЯ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

З першых да апошніх дзён акупацыі Мінска гітлераўцамі інтэлігенцыя горада заставалася адданай свайму народу, вызначала сваё месца ў агульным страі барацьбітоў падполля з фашызмам. Падпольныя групы ўзнікалі ў розных месцах горада.

Група, якой кіравала В. Ф. Мацюшка, былы намеснік дырэктара навукова-даследчага інстытута харчовай прамысловасці БССР, склалася летам 1941 г. У яе састаў уваходзіў камуніст Л. Д. Казючыц, іншыя саслужыўцы Веры Феафанаўны па інстытуту. Кватэра кіраўніка стала явачнай кватэрай падпольшчыкаў. Камсамолец Ф. Пяско не здаў ваенным уладам радыёпрыёмнік і ўстанавіў яго ў падвале дома № 29 па вуліцы Энгельса. Патрыёты слухалі і запісвалі сводкі Саўінфармбюро, якія распаўсюджвалі сярод насельніцтва. У лістоўках, што з'яўляліся раніцай на платах і дамах, яны заклікалі да барацьбы з фашыстамі. Члены групы збіралі таксама зброю, якая перадавалася ў партызанскую брыгаду В. Т. Варанянскага.

У сакавіку 1942 г. паліцыя бяспекі і СД нанеслі мінскаму падполлю цяжкі ўдар. Гітлераўцам удалося высачыць і арыштаваць многіх актыўных падпольшчыкаў. Вораг разлічваў, што пасля знішчэння «падпольных завадатаяў», як яны пісалі, спыніцца ўсялякая барацьба ў горадзе. Але месцы загінуўшых займалі новыя людзі. Гэта былі энергічныя, смелыя, таленавітыя арганізатары.

У пачатку мая 1942 г. на кватэры В. Ф. Мацюшка адбылося пасяджэнне падпольнага гаркома партыі. На ім было прынята рашэнне аб стварэнні ў Мінску пяці падпольных райкомаў. Крыху пазней быў створаны і шосты. Гаспадыня кватэры стала намеснікам сакратара Варашылаўскага райкома